| | |
|---|---|
| Содействие Министерству природных ресурсов и охраны окружающей среды и его территориальным органам | Участие студентов-волонтеров в заседаниях ОКЭС при Витебском областном комитете природных ресурсов и охраны окружающей среды, совместных экологических акциях, семинарах, форумах. |
| Стажировка в общественные экологи | Оказание помощи студентов-волонтеров сотрудникам Витебской городской инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды. |

**Заключение.** Одним из приоритетных направлений государственной молодежной политики и формой экологического воспитания и просвещения, способствующей формированию экологической культуры студенческой молодежи является волонтерское движение. Его организация и разнообразные направления дают возможность эффективного способа вовлечения молодежи в социальную практику, расширения возможностей для получения новых знаний и навыков, будущей профессии эколога, раскрытия талантов, самореализации и лидерского роста.

**Литература**

1. Певнева, А.Н. Организация волонтерской деятельности в молодежной среде: практическое пособие / А.Н. Певнева, О.Н. Филимончик, Н.Н. Учаева; Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2020. – 47 с.

2. Беженарь, Ю.П. Организация работы студенческого волонтерского отряда «Экологический патруль» на базе ВГУ имени П.М. Машерова / Ю.П. Беженарь, И.А. Литвенкова, Е.В. Шаматульская // Вышейшая школа – 2020. – № 2. – С. 38–41. URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/248365.

# ДА 50-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ ЛУЖАСНЯНСКАГА ДЭНДРАПАРКУ

***М.В. Півавар***

**Віцебскае кадэцкае вучылішча, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь**

У в. Лужасна, што па факту ўключана ў гарадскую мяжу Віцебска, ёсць батанічны помнік прыроды мясцовага значэння – Лужаснянскі дэндрапарк. У гэтым годзе ён адзначае 50-годдзя са дня закладкі. Паркі, як і людзі залежны ад ўзроста – маюць сваю маладосць, сталасць і старасць. Палова стагоддзя, гэта вялікі тэрмін, варта паглядзець на стан помніка прыроды, якія ён мае праблемы, перспектывы. Чым можна дапамагчы парку, каб і будучыя пакаленні маглі любавацця ягонымі алеямі і расліннасцю. Пытанне актуальна, бо ў Віцебскім раёне няма помнікаў прыроды, хаця нашымі даследаваннямі іх выяўлена некалькі дзесяткаў яшчэ больш чым 20 гадоў таму [2]. Стан яго неадназначны. Дрэвы старэюць, садоўніка ці работніка, які б даглядаў за станам парка няма. Пасля сыходу на пенсію стваральніка парка і нястомнага яго даглядчыка – Мікалая Трафімавіча Ражкова (1935–2023) стан парка стаў пагаршацца. Эпізадычна робіцца выкашванне травы каля сцяжынак, высечка засохлых дрэваў, але гэтымі працамі догляд абмяжоўваецца. Адной з мэтаў артыкула з’яўляецца не толькі прыцягнуць увагу да стана помніка прыроды, але і прыгадаць імя і пакінуць памяць пра апантанага аматара прыроды, стваральніка дэндрапарка – М.Т. Ражкова.

**Матэрыял і метады даследавання.** Некалькі словаў пра гісторыю. Створаны дэндрапарк быў у 1974 г. у гонар святкавання 30-годдзя вызвалення БССР ад нямецкафашысцкіх захопнікаў. Стваральнік яго і амаль ўсіх зялёных насаджэнняў у былым тэхнікуме – Мікалай Трафімавіч Ражкоў. Нарадзіўся Мікалай Трафімавіч у в. Гарбуны Касплянскага (цяпер Смаленскі) раёна Смаленскай вобласці ў 1935 г. З самага дзяцінства цікавіўся раслінамі. Дзед навучыў рабіць прышчэпкі. Цікавасць вызначыла прафесію. Скончыў факультэт біялогіі і асноў сельскагаспадарчай вытворчасці БСГА (1966). Пазней, каб працаваць у навучальнай установе, скончыў педагагічны факультэт.

З 1968 г. М.Т. Ражкоў пачаў працваць у Лужаснянскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Стаў весці спецыяльныя прадметы агранамічага цыкла: сельскагаспадарчую меліярацыю і глебазнаўства. Разам са студэнтамі выкладчык стаў на практыцы азеляняць тэрыторыю.

На пачатку 1970-х зарадзілася ідэя стварыць пры тэхнікуме дэндрапарк. Месца выбраў на беразе Дзвіны, там, дзе яшчэ на пачатку XX ст. быў высаджаны пладовы сад. У 1930-я гг. там быў стадыён. Яго у гадов Вялікай Айчыннай вайны немцы выкарыстоўвалі як аэрадром. Падрыхтоўчая праца пачалася з 1970-га года: ліставанне з батанічнымі садамі, набыццё семян, высадка іх і вырошчванне саджанцаў. Першапачаткова парк складаў 4 га. З часам ён разросся да 8,8 га. тут былі высаджаны больш за 250 відаў дравесна-кустарнікавых парод. У тым ліку сабраны 35 відаў таполяў, 10 клёна, івы, спірэі, бэзу. Значная колькасць з іх былі высаджаны і выгадаваны ў пітомніку, які быў утвораны пры дэндрапарку для рамонта насаджэнняў.

Высадкай дэндрапарка М.Т. Ражкоў не абмежаваўся. Азелянне праводзілася ўсёй тэрыторыі студэнцкага гарадка, тэрыторыі дамоў, дзе пражываюць выкладчыкі тэхнікума. І зараз яны радуюць вока. У 1980-я гг. ЛСХТ атрымаў дыплом на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР у Маскве за азеляненне тэрыторыі.

У 1993 годзе ён атрымаў статус поміка прыроды. Рашэннем Віцебскага раённага выканаўчага камітэта ад 30 мая 2012 г. № 667 “Об объявлении заказников и памятников природы местного значения” ахоўныя абавязальніцтвы на ўтрыманне батанічнага помніка прыроды былі ўскладзены на аграрны каледж установы адукацыі “Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны”. Якія яна па факту і несла на працягу папярэдняга існавання дэндрапарка.

На пачатку 2000-х гг. у дэндрапарку была праведзена спроба зрабіць добраўпарадкаванне, за кошт раённай экалагічнай інспекцыі, але вынікі яго досыць неадназначныя. З аднаго боку – была ўсталявана металічная агароджа, з другога боку у некаторых алеях і ў цэнтры парка была пакладзена тратуарная плітка. Пры гэтым сцежкі разрылі будаўнічай тэхнікай, пашкодзілі карані, засыпалі шэраг дрэваў і кустарнікаў вышэй шэйкі, што прывяло да таго, што шмат з іх загінулі ці доўга хварэлі. А праз час большая частка пліткі была скрадзена невядомымі і засталася толькі ў некаторых месцах.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Сучасны стан дэндрапарка выклікае заклапочаннасць. Ён мае шмат праблем. Пра некаторыя з іх ужо пісалася ў СМІ, у тым ліку і нашым артыкуле “Лужаснянскі дэндрапарк: праблемы і магчымыя шляхі іх вырашэння” [3]. За мінулы амаль дзесятак гадоў іх амаль не паменшала. За 50 гадоў поўная колькасць дрэваў і кустарнікаў страчана. Страчаны амаль усе травяністыя расліны. Адны вымерзлі (таполя серабрыстая), іншыя ўсохлі (міндаль), некаторыя былі скрадзены (ядловец казацкі, абляпіха і інш.). Па плану прадугледжвалася, што дрэвы вырастаюць у метрах 15–20 ад сцяжынак. Бліжэй, у 5–10 м да трапы высаджваліся кустарнікі. Такая схема дазваляла любавацца як дрэвамі, так і кустамі. На жаль у шэрагу месцаў дрэвы і кусты разрасліся, знаходзяцца вельмі блізка да сцяжынак, у некаторых месцах і нават падступаюць да іх уплатную.

У шэрагу месцаў парк моцна зарос маладняком, асабліва ліпавы і таполевыя сектары. Кедры сібірскія амаль усе ссохлі. Кепска праглядаецца плантацыя шалковіцы. У запланаваных калісці пасадках асобных дрэў (ліпы, глогу, арэхаў) самасевам выраслі дрэвы іншых парод. Іх трэба прыбіраць.

Змянілася трасіроўка сцяжын. У шэрагу месцаў яны ідуць не па запланаваных месцах, а там, дзе натапталі наведвальнікі. У шэрагу месцаў ёсць засоранасць дрэвамі – дубам, ліпай. Нідзе не захаваліся альтанкі і лаўкі, якія рабіліся са старых, ссохлых ствалоў дрэваў.

Вялікай праблемай з’яўлецца падмыў берага. У веснавую паводку 2023 г. вельмі моцна пацярпеў бераг Дзвіны ў месцы, дзе знаходзіцца сутока р. Лужаснянка і Дзвіна. Тут моцны струмень вады, які ўтвараўся ад спуска вады на Віцебскай ГЭС моцна падмыў бераг і шмат вязаў, якія добра ўмацоўвалі бераг. У 2024 г. некаторыя дрэвы падмыты і заваліліся ў раку Дзвіну, некаторыя могуць заваліцца на працягу хуткага часу.

Моцна церпяць ад галандскай хваробы вязаў пасадкі вяза. А менавіта яны найбольш прыгожа выглядаюць у пару залатой восені, моцна падтрымлітваюць бераг сваімі каранямі і не даюць яму абрынуцца ў раку Лужаснянку. Можна прагназаваць, што праз некаторы час яны будуць згублены.

У парку няма лавак, абсталяваных месцаў – ландшафтных пляцовак, асабліва на беразе ракі Дзвіна і Лужаснянкі, дзе можна было б палюбавацца на краявіды, якія ўтвараюцца спалучэннем расліннасці і вады. Няма ў парку штатнай адзінкі – ні ахоўніка, ні прыбіральшчыка, ні садоўніка, ні, тым болей ландшафтнага дызайнера ці паркавага архітэктара, які б мог даглядаць за дравеснай калекцыяй і паркавай прасторай на навукова абгрунтаванай аснове.

Даўно пара зрабіць інвентарызацыю расліннага свету. З заяўленых амаль 250 відаў вышэйшых сасудзістых раслін, якія ўказаны ў пашпарце помніка прыроды на нашы дні існуюць значна менш. Апісанне дэндрапарка, якое падаецца на сайце міністэрства прыродных рэсурсаў “Лужаснянскі дэндрапарк” [1] даўно не адпавядае рэчаіснасці: няма ракарыя, альпіскай горкі, калекцыйнага пітомніка, шэрагу з пералічаных відаў раслін.

**Заключэнне.** Стан батанічнага помніка прыроды мясцовага значэння “Лужаснянскі дэндрапарк”, якому ў гэтым годзе спаўняецца 50 гадоў выклікае заклапочаннасць. Па факту, узрост часткі насаджэнняў некалькі большы, бо першыя пасадкі былі праведзены яшчэ ў канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг. Парк мае шэраг праблем. Першую чаргу трэба вызначыцца з канцэпцыяй яго далейшага развіцця. Пакуль ён нагадвае “бабулін” сад, ці парк пры старасвецкай панскай сядзібе, калі побач з закінутым домам вырастаў калісці добра дагледжаны, а цяпер досыць здзічэлы парк. Трэба правесці інвентарызацыю расліннага свету, устаноўку шыльд каля дрэваў. Высечку расліннасці, якая не адпавядае плану развіцця дэндрапарка, удакладніць трасіроўку сцяжын. Асобна трэба вырашаць праблему абрушэння берага і яго умацавання, асабліва ў вусці Лужаснянкі і Дзвіны. Лічым, што вырашыць значную частку праблем можна было б сіламі Лужаснянскага аграрнага каледжа, які павінны выконваць іх у адпаведнасці з ахоўнымі абавязальніцтвамі [4].

**Літаратура**

1 Лужеснянский дендропарк [Электронны рэсурс] // Міністэрства прыродных рэсурсаў. Рэжым карыстання: https://www.minpriroda.gov.by /ru/ svg_map-ru/getElement/890. Дата доступу: 15.10. 2024 г.

2 Півавар, М.В. Гісторыка-культурная і прыродная спадчына ў наваколлях Віцебска (Некаторыя звесткі пра аб’екты, якія могут быць зарэгістраваны як помнікі прыроды, гісторыі і культуры) / М.В. Півавар // Веснік ВДУ. – 2003. – № 1. – С. 3–11.

3 Півавар, М.В. Лужаснянскі дэндрапарк: праблемы і магчымыя шляхі іх вырашэння / М.В. Півавар // Экологическая культура и охрана окружающей среды: II Дорофеевские чтения: материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 29–30 ноября 2016 г. / Витеб. гос. ун-т; редкол.: И.М. Прищепа (отв. ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2016. – С. 172–174.

4 Паспорт и охранное обязательство ботанического памятника природы местного значения “Лужеснянский дендропарк” // Бягучы архіў віцебскай гарадской і раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў